# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist



## Вячеслав Петрович РАГОЙША

## Вячаслаў Пятровіч РАГОЙША

## Viachaslau Piatrovich RAHOJSHA

Пакінуўшы глыбокі смутак у сэрцах усіх, хто яго ведаў, 7 лістапада 2025 г. пайшоў з жыцця Вячаслаў Пятровіч Рагойша. Ён быў светлай душы чалавекам і выдатнейшым вучоным.

Нарадзіўся Вячаслаў Пятровіч 5 чэрвеня 1942 г. у сялянскай сям'і ў мястэчку Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Усё жыццё ён заставаўся патрыётам сваёй малой радзімы: не толькі падоўгу жыў у бацькоўскай хаце, але і актыўна прапагандаваў родныя мясціны. Шэсць разоў за свае сродкі ў Ракаве і Валожыне Вячаслаў Пятровіч збіраў міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі, прысвечаныя малой радзіме. Таксама за свае сродкі на працягу дзесяцігоддзяў ён выдаваў газету «Ракаўскі шлях», дзе змяшчаў шматлікія даследаванні, прысвечаныя згаданай мясцовасці, якую нястомна вывучаў.

Вучыўся В. П. Рагойша заўсёды на выдатна. У 1963 г. з адзнакай скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, а затым працягнуў навучанне ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры. У 1965 г. ён служыў у Савецкай арміі, у 1967 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. З таго часу і амаль да скону Вячаслаў Пятровіч выкладаў гісторыю беларускай літаратуры і ўводзіны ў літаратуразнаўства на філалагічным факультэце БДУ. У 1993 г. у Маскве ён абараніў доктарскую дысертацыю, у 1994 г. атрымаў званне прафесара.

Кожная лекцыя Вячаслава Пятровіча заканчвалася апладысментамі студэнтаў. Так бурна, не стрымліваючы свайго захаплення, адгукаліся слухачы на выключнае прамоўніцкае майстэрства, фенаменальную эрудыцыю і, галоўнае, апантанасць лектара прадметам свайго выкладання – літаратурай. Выклікала захапленне і інтэлігентнасць В. П. Рагойшы, якая пры поглядзе на навукоўца, пры першых яго словах адразу брала ў палон. Для студэнтаў, аспірантаў і калег ён заўсёды быў прыкладам мудрасці і добразычлівасці.

Вячаслаў Пятровіч – лідар на філфаку, а магчыма, і ў рэспубліцы па колькасці апублікаваных навуковых прац. Ён быў лепшым тэарэтыкам літаратуры ў Беларусі, тэарэтыкам перакладу, знаўцам сувязей беларускай літаратуры з літаратурамі іншых славянскіх краін. Доктар філалагічных навук прафесар М. М. Хмяльніцкі адзначае, што В. П. Рагойша з'яўляецца аўтарам звыш тысячы навуковых работ, апублікаваных у Беларусі і асобных

CC BY NC

краінах Еўропы, частка якіх зафіксавана ў бібліяграфічным паказальніку, выдадзеным бібліятэкай БДУ да 60-годдзя прафесара, а таксама ініцыятарам, рэдактарам і суаўтарам шматлікіх літаратуразнаўчых выданняў, матэрыялаў канферэнцый і круглых сталоў. У ліку такіх работ каля трох дзясяткаў асобных выданняў («Паэтыка Максіма Танка. Культура вобраза. Характар верша» (1968), «Пераклаў Якуб Колас…» (1972), «І нясе яна дар…: беларуская паэзія на рускай і ўкраінскай мовах» (1977), «Гутаркі пра верш. Метрыка. Рытміка. Фоніка» (1979), «Паэтычны слоўнік» (1979, 1987, 2004), «Проблемы перевода с близкородственных языков: белорусско-русско-украинский поэтический взаимоперевод» (1980), «Напісана рукой Купалы: архіўныя знаходкі» (1981), «Кантакты» (1982), «Вяршыні: з невядомага і забытага пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча» (1991), «І адгукнецца слова ў слове…» (1992), «Тэорыя літаратуры ў тэрмінах» (2001), «Уводзіны ў літаратуразнаўства. Вершаванне: курс лекцый» (2002), «Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці» (2009), «Беларускае вершаванне» (2010), «Мой Трыглаў: Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч» (2012), «Асновы вершазнаўства» (2013) і інш.). Пералічаныя выданні з'яўляюцца сведчаннем высокага прафесіяналізму Вячаслава Пятровіча, яго шматаспектнага і ўдумлівага стаўлення да скарбніцы нацыянальнага і сусветнага прыгожага пісьменства. Літаратуразнаўчыя працы В. П. Рагойшы заўсёды вылучаюцца не толькі навуковай кампетэнтнасцю, шырынёй ахопу матэрыялу, але і выразнасцю, арыгінальным падыходам да прадмета даследавання».

У перыяд з 1994 па 2018 гг. В. П. Рагойша кіраваў кафедрай тэорыі літаратуры (зараз кафедра тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства) філалагічнага факультэта БДУ, адзінай у краіне. У дзейнасці кафедры загадчык узяў курс на арганічнае зліццё адукацыі і навукі. Пад кіраўніцтвам Вячаслава Пятровіча праводзілася вялікая навукова-даследчая работа, у якой актыўна ўдзельнічалі не толькі выкладчыкі, але і аспіранты, магістранты, студэнты. Ні адна кафедра на факультэце, апроч той, што ўзначальваў В. П. Рагойша, не выйграла столькі студэнцкіх грантаў на распрацоўку навуковых тэм. Тут вывучалі тэарэтычныя аспекты развіцця фальклору, шэраг найбольш важных пытанняў тэорыі літаратуры (цэласнасць мастацкага твора, вершаванне, літаратурная вобразнасць, віды вобразаў і інш.), розныя мадэлі свету ў вуснай народнай творчасці і літаратуры, міжлітаратурныя сувязі. Менавіта на гэтай кафедры на працягу дзесяцігоддзяў чытаўся лекцыйны курс «Гісторыя і тэорыя сусветнай культуры», а таксама выкладаліся дысцыпліны па асобных культурах народаў свету, якія карысталіся велізарнай папулярнасцю ў студэнтаў. Пры кафедры працавала і працуе адзіная ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору, дзе праводзіцца значная навуковая работа.

У Вячаслава Пятровіча засталося шмат вучняў і паслядоўнікаў (былыя студэнты, магістранты, аспіранты), ёсць вучні нават у Грузіі, Украіне, Польшчы. Да тых, каго ён выправіў у навуковую дарогу, непасрэдна кіруючы напісаннем дыпломных і дысертацыйных прац, можна дадаць шматлікіх дактароў і кандыдатаў навук, чые інтарэсы В. П. Рагойша шчыра адстойваў шмат гадоў у спецыялізаваным савеце Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, а таксама тых, хто абараняўся пад яго старшынствам у дысертацыйным савеце па літаратуразнаўстве ў БДУ.

Пад кіраўніцтвам Вячаслава Пятровіча калектыў аўтараў стварыў падручнікі, вучэбныя дапаможнікі для ўстаноў вышэйшай адукацыі, а таксама для базавай школы, школы з паглыбленым вывучэннем літаратуры, якая існавала ў 1990-я гг. Такая дзейнасць была ў многім наватарскай і ў гісторыі літаратуры, і ў методыцы выкладання.

Сваімі маштабамі ўражвае і грамадская дзейнасць В. П. Рагойшы. Ён быў прэзідэнтам Міжнароднага фонду Янкі Купалы, акадэмікам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, сябрам рэдкалегіі розных навуковых і навукова-метадычных выданняў, старшынёй навукова-метадычнай камісіі (секцыя беларускай мовы і літаратуры) Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, старшынёй секцыі беларускай мовы і літаратуры вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі, сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1969 г. як даследчык літаратуры, крытык, перакладчык, паэт. Пад навуковым кіраўніцтвам В. П. Рагойшы выходзілі шматлікія зборнікі артыкулаў, напрыклад «Міфалогія – фальклор – літаратура: праблемы паэтыкі».

Дзейнасць Вячаслава Пятровіча адзначана на дзяржаўным узроўні шматлікімі граматамі ад розных вучэбных і навуковых устаноў, у тым ліку замежных, медалямі, ордэнам Францыска Скарыны.

У навуковай і адукацыйнай карпарацыі гуманітарыяў Беларусі В. П. Рагойша быў адной з ключавых асоб, бясспрэчным аўтарытэтам. Па разнастайнасці інтарэсаў і дзейнасці, па глыбіні навуковых даследаванняў яму, бадай, не было роўных. Памяць пра Вячаслава Пятровіча назаўсёды застанецца ў філолагаў і ўсіх дзеячаў культуры рэспублікі.

***Т. І. Шамякіна***[1]

[1]*Татьяна Ивановна Шамякина* – доктор филологических наук, профессор; независимый исследователь.
*Таццяна Іванаўна Шамякіна* – доктар філалагічных навук, прафесар; незалежны даследчык.
*Tatyana I. Shamyakina*, doctor of science (philology), professor; independent researcher.
E-mail: *shamyakina@tut.by*